5. Азнаёмцеся з відэазапісам песні «Зорка Венера» на музыку Сымона Рак-Міхайлоўскага ў выкананні Валерыя Дайнекі. Скажыце, ці адпавядае мелодыя гэтай кампазіцыі зместу і інтанацыі верша Максіма Багдановіча.
6. Прачытайце ў Слоўніку літаратуразнаўчых тэрмінаў азначэнне слова *раманс*. Ці суадносіцца верш Максіма Багдановіча з гэтым жанрам?
7. Верш Антона Дэльвіга «Салавей», які вы вучылі на ўроках рускай літаратуры ў VII класе, таксама адносіцца да жанру раманса. У чым жанравае падабенства такіх розных на першы погляд рамансаў рускага паэта і Максіма Багдановіча?
8. Узнавіце радкі, якія паўтараюцца і вызначаюць адметнасць кампазіцыі верша (трэнажор па вершы Максіма Багдановіча «Раманс»). Чаму радкі паўтараюцца не поўнасцю? Магчыма, так ствараецца ўражанне рэха, успаміну? Якія яшчэ сродкі надаюць твору напеўнае, меладычнае гучанне?
9. Вывучыце верш на памяць.



## *Аркадзь Куляшоў*

*1914–1978*

Куляшоўская паэзія з вялікай мастацкай сілай і пераконлівасцю даводзіць нам, што духоўнае станаўленне і існаванне чалавека ў свеце немагчыма без неспакою, пошуку, драматычнага пераадолення жыццёвых перашкод, пачуцця вялікай адказнасці за сябе і свой час...

*В. Бечык*

### БЫВАЙ...

Бывай, абуджаная сэрцам, дарагая.
Чаму так горка, не магу я зразумець.
Шкада заранкі мне, што ў небе дагарае
На ўсходзе дня майго, якому ружавець.

Ці помніш першае нясмелае прызнанне?..
Над намі жаўранкам звінеў і плакаў май.
Назаўтра золкае, туманнае світанне,
Суровы позірк твой і мой нямы адчай...

Пайшла, пакінуўшы мне золкі і туманны,
Палынны жаль смугой ахутаных дарог,
Каб я хвілінны боль і горыч гэтай раны
Гадамі ў сэрцы заглушыць сваім не мог.

Пайшла, ніколі ўжо не вернешся, Алеся.
Бывай, смуглявая, каханая, бывай.
Стаю на ростанях былых, а з паднябесся
Самотным жаўранкам звініць і плача май...

Першы варыянт верша «Бывай...» А. Куляшоў напісаў у чатырнаццаць гадоў і прысвяціў яго сваёй шаснаццацігадовай сяброўцы Алесі Карыткінай. Вобраз дзяўчыны прайшоў праз многія творы паэта. Маладыя людзі доўгія гады падтрымлівалі прыяцельскую перапіску, аднак сустрэцца ў рэальным жыцці пазней ім так і не ўдалося.

1. Якія выразы з верша сведчаць, што яго лірычны герой — юнак на пачатку жыццёвага шляху?
2. Як малюнкі прыроды адпавядаюць душэўнаму стану чалавека?
3. Імя дзяўчыны гучыць толькі ў самым канцы верша. Якімі эпітэтамі называе каханую паэт? Якой яна вам уяўляецца?
4. Паглядзіце відэазапіс песні «Алеся» на музыку Ігара Лучанка ў выкананні ансамбля «Песняры» і вызначце, якіх радкоў верша там няма.
5. Прачытайце ў Слоўніку літаратуразнаўчых тэрмінаў азначэнне слова *элегія* і дакажыце, што верш «Бывай...» можна аднесці да гэтага жанру.
6. Ці ведаеце вы музычныя творы, названыя элегіяй? Што аб'ядноўвае гэты жанр у музыцы і паэзіі?


Правообладатель Акадэмія адукацыі